УДК 39 (476-22)

***Сумко Алена***
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Полацк, Беларусь*

# ПАСЛЯВАЕННАЯ РЭЧАІСНАСЦЬ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ РАССОНШЧЫНЫ)[4]

Разглядаецца пасляваенная рэчаіснасць лакальнай вясковай супольнасці. Вызначаны ключавыя моманты дзіцячых успамінаў і ахарактаразаваны адметнасці рэпрэзентацыі складанага гістарычнага перыяда.

***Ключавыя словы: пасляваенная вёска, вусная гісторыя, дзеці і падлеткі, голад, стратэгія жыццезабеспячэння.***

У якасці крыніц даследавання выступаюць уласныя запісы аўтара, а таксама матэрыялы палявых этнаграфічных экспедыцый Полацкага дяржаўнага ўніверсітэта. Прадметам даследавання выступае ўласна змест успамінаў пра пасляваенную рэчаіснасць Расонскага раёна, які ўваходзіў у лік 36 найбольш пацярпелых ад нацыстаў на тэрыторыі БССР. Архіўныя дакументы сведчаць, што ў вызваленым Расонскім раёне  з 16 сельскіх саветаў у 10 былі цалкам знішчаны ўсе грамадзскія і жылыя забудовы, сельскагаспадарчы інвентар і дамашнія жывёлы, а з 38 000 даваенага насельніцтва засталося 17 508 чалавек, якія ва ўмовах ваеных дзеянняў 1944 г. пасяўныя работы не праводзілі  [1, л. 13]. Частка насельніцтва Расонскага раёна амаль год хавалася ў лясах, а частка была эвакуіравана ў раёны Каліненградскай вобласці. Пасля вяртання жыхары апынуліся ў надзвычай экстрэмальных умовах. Пра гэта сведчаць як архіўныя дакументы, так і матэрыялы вуснай гісторыі, якія фіксуюць унікальную інфармацыю пра пасляваенную паўсядзённасць пэўнай вясковай супольнасці.

---

[4] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД-РФФД "Субкультура детства в дискурсе устной истории, языке и фольклоре Витебско-Псковского пограничья XX - начала XXI века", дамова № Г20Р-095

Сведчанні рэспандэнтаў надаюць чалавечае вымярэнне вельмі складанаму перыду айчыннай гісторыі, а таксама дапамагаюць вывучыць новыя сацыяльна-культурныя з'явы, непарыўна звязаныя са зmененымі сацыяльна-эканамічнымі ўмовамі. Пераважная большасць рэспандэнтаў – пажылыя жанчыны даваеннага або ваеннага пакалення, якія былі ў разглядаемы перыяд дзецьмі або падлеткамі. Яны перажылі жахі Вялікай Айчыннай вайны, страту блізкіх, а потым разам з дарослымі ва ўмовах жыллёвай неўладкаванасці і недаядання, дапамагалі аднаўляць гаспадарку. Своеасаблівай спадчынай вайны стала цэлае пакаленне дзяцей, якія выраслі ў няпоўнай сям'і. Па сцвярджэнні псіхолагаў, сацыяльная памяць пачынае фармавацца ўжо з 4-гадовага ўзросту і ўключае ў сябе фрагментарныя, найбольш эмацыйна афарбаваныя эпізоды, больш асэнсаванымі, суадноснымі з гістарычным кантэкстам дзіцячыя ўспаміны становяцца ў 9-гадовым узросце і затым трансфармуюцца ў памяці дарослага пад уздзеяннем сацыякультурных фактараў [2, с.282]. Аднак вайна заставіла пасталець раней часу цэлае пакаленне, што падцвярджаюць матэрыялы вуснай гісторыі. Успаміны пра пасляваенную рэчаіснасць адрозніваюцца эмацыянальнасцю, што абумоўлена полаўзроставай і гендэрнай спецыфікай ўспрымання гістарычных падзей. Як адзначае У. А. Лобач “дзіцячы погляд на свет больш непасрэдны, наіўны, у пэўным сэнсе фальклорны, не абцяжараны ідэалагічнымі канструкцыямі, калі ўвагу могуць прыцягваць рэчы ці з’явы, неістотныя для дарослых. З другога боку дзіцячая памяць фіксавала рэальныя падзеі, якія былі важнымі як для сям’і, так і для вайсковай грамады” [3, с. 89].

Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць, што рэчаіснасць пасля вызвалення ад нацысцкай акупацыі захавала сваю злабадзённасць. У дзіцячых успамінах знайшла адлюстраванне пасляваенная разруха, калі ні дома, ні агарода, ні жывёлы – жыць няма дзе, есці няма чаго: “*Уся дзярэўня згарэўшы. Весь Расонскі раён счытай згарэўшы. На пянёк сталі, пастаялі, пакруціліся, нічога не было… бур’ян*” [4]. У гэтых апавяданнях з аднаго боку даволі выразна перадаецца атмасфера адчаю, а з другога – жаданне жыць. Нават у бязвыхаднай, здавалася, сітуацыі, падлеткі, якія аказаліся адзін на адзін з суровай рэчаіснасцю, дэманстравалі стойкасць духу і сілу характару. У якасці прыклада можна прывесці ўспаміны Кандрацьевай Надзеі Антонаўны, якая разам з сястрой, пасля вызвалення Расонскага раёна ад нацыстаў, вярнулася на папялішча бацькоўскай сядзібы, пасля амаль 9 месяцаў знаходжання ў лесе. “М*ы прыехалі с сестрой на чыстае поле. Тады паехалі, тут былі ў Ражнове нямецкія бункеры, мы с сястрой тады ўзялі такую павозку, была нямецкая, калесы такія бальшыя-бальшыя,*

*І мы паехалі за даскамі, каля рэчкі выкапаныя акопы іхныя і яны даскамі абіўшы былі гэтыя акопы, вот мы тых дасок надралі, а ў нашай бані асталося ну, вот такі вянок, метр где-та. Ну, вот павязем жа гэтых дасок і гаворым будзем дзелаць сабе якую - небудзь хату. Жыць та нада. І вот цягнулі гэны доскі. На сабе, дзве дзяўчоначкі, яна – з 27 года, а я – з 28 года. І наклалі столькі дасок, так надралі.. а доскі нада былі. Мы цягнулі.. Я да кладбішча дацягнула, а тады завалілася на кладбішчы, ды і цяпер не забылася, лягла і галашу: "Каб я сабе гэты доскі на гроб прыцягнула, каб я памерла, як я ужо жыць не хачу". Дужа цяжка было, а пясок, а калесы гэтыя рэжуцца. Так і зажыліся, баньку троху накрылі, неяк зделалі і сядзелі ў гэтай бані*". [4]. Дзве дзяўчынкі вырашылі чакаць бацькоў, якіх страцілі падчас карнай экспедыцыі. Некалькі месяцаў яны ўдваіх былі вымушаны змагацца за выжыванне, максімальна выкарыстоўваючы ўсе наяўныя рэсурсы. Бацькі вярнулася толькі летам "*У іюні месяцы. Якраз нас прыехаў начальнік забіраць у детдом. Ужо запісывалі нас, ужо ўсё піша і ў сястры спрашываіць, якія годы, якое што. Забяруць вас, тады машына, забяруць у детдом, а слава Богу, нашы бацькі явіліся*" [4].

Скразной лініяй ва ўспамінах пра жыццё пасля вызвалення праходзіць тэма голаду, так як на спустошанай тэрыторыі вельмі востра стаяла праблема з прадуктамі харчавання. Дзіцячыя ўспаміны жыхара в. Сядлова дазваляюць зразумець жудасную рэчаіснасць праз адчуванні простага вясковага хлопчыка: "*Страшныя вешчы. Елі дохлага каня, ляжаў ужо ваняў. Не очень елі девчонкі, а я помню ел уже малый. Вот такі жывот быў*" [5].

У ежу ішло ўсё, што можна было есці. "*Кісліца і крапіва – гэта не беда, асот елі! Насморгаем лісцікаў, зварым, ёсць чым – прыбелім, а нет, так і так хлебалі*" [6]. Елі маладыя лісточкі ліпы, корань аіру. Пяклі аладкі з шчаўля, лебяды, крапівы. Дабаўлялі ў ежу апілкі. У першы год пасля вызвалення самым актуальным прадуктам была мерзлая бульба, якая засталася на палях: *"Ай, не дай Бог, як мы выжывалі. Па первасці, первы год ляжала будьба ў людзей закапаная ў ямах. Елі гэтую бульбу старую. Яна пад вясну на крахмал здзелалася неяк…А на другі год гарод пахаць нечым было, мама нескалька бульбін пасадзіла, не знаю, дзе яна іх брала, а там адзін мужык прыйшоў ноччы і выкапаў. Ен быў бедны, беззашчытны. Многа з голаду паўмірала ў Валатоўках. Я помню вот бабка адна памерла, тады гэты Янук, які бульбу быў выкапаўшы, памер з голаду*" [7].

Дзіцячая памяць захавала нават смакавыя адчуванні пасляваеннай кухні, якія рэспандэнты пранеслі праз усё жыццё. "*Фасолю ней-*

*кую чорную прысылала Амерыка. Калі мукі даюць, калі там крупы, а больше фасоль давалі, калі белую, калі чорную. Фасоль чорная-чорная. Мне адзін раз хто-та даў на семяну. Кажу: "Каб пайшла яна, гэтая фасоль, вайна успамінаецца, голад, як я яе ела, гэтую чорную. Я яе садзіць ня буду!* " [7].

Дзіцячыя ўспаміны жыхароў Расонскага раёна дэманструюць розныя жыццёвыя сцэнарыі прыстасавання да новай рэчаіснасці і сведчаць пра павышэнне ролі дзяцей у сістэме пасляваеннага жыццезабеспячэння. Зыходзячы з канкрэтнай сітуацыі выбудоўваліся індывідуальныя стратэгіі, якія былі накіраваны на выжыванне сям'і ў вельмі складаных абставінах. Іншы раз дзеці траплялі ў сітуацыю, калі яны станавіліся на пэўны час асноўнымі кармільцамі : "*А мы не, мы не памёрлі, мы з сястрой хадзілі, ну як...па жэбрах, па старцах. ...Баравуха, ай, якія дзярэўні былі туды і хадзілі. Наберым штонебудзь – давалі людзі. Прынясём дамоў. Мама балела сільна. Ой, яе малярыя трасла і тады ангіна нейкая была, не дай Бог, гланды такія – гузы, а мы прыйдзем з сястрой, а тады пойдзем у лес, жылі каля лесу блізенька, дроў нацягаем ёй і апяць пашлі, так і выжылі*" [7]. Успаміны перадаюць пачуццё клопату пра маці і дэманструюць "даросласць" пры пошуках ежы і сродкаў да існавання.

Ва ўмовах недахопу працоўных рук, дзеці і падлеткі ўключаліся ў калгасную працу, разам з бацькамі працавалі ў полі. *"– А мы ж тады ужо у калхоз пашлі, а ў калхозе нада было робіць.* [– А кагда вы у калхоз пашлі?*] – Прыйшлі з лесу так і пашлі ў калхоз. [–* Дык, а вы ж маленькія былі.*] – А там не глядзелі, што мы маленькія былі. Мы ж семяну прыносілі з Полацка, як зажывалі калхоз после вайны. Сеяцьто нечым было. Вот сперва шэсць чалавек за плугом становяцца, аром, узаралі кусочак, на заўтра ідём за семяной. Вот мне было 15 гадоў, я хадзіла ў Полацк, мне пуд семяны на плечы. Я з Полацка несла дамоў. І каб ужо ні адну семянінку не узяўшы, там звешваюць. Напрыклад, звешваюць нам па пуду і што б дамоў прынеслі, што б пуд быў гэты"*[4].

Сур'езную небяспеку для жыцця ў першыя пасляваенныя гады прадстаўлялі замініраваныя ворныя палі, бальшакі, ускраіны лесу і г.д. Успаміны фіксуюць даныя пра ахвяры і няшчасныя выпадкі ад кінутых баяпрыпасаў і схаваных мін. У групу рызыкі ў першую чаргу траплялі дзеці і падлеткі: "*Адзін мальчышка каля дзярэўні капсулю знайшоў, ад міны можа неразарваўшайся, разарвала яго*" [8]. Дзіцячая памяць фіксавала не толькі трагічныя выпадкі, але сітуацыі, калі цікаўнасць пераважвала страх: "*Ішла-ішла, гляжу на ялушке граната вісіць. Пашла дамоў, Ваньке расказала, брату дваюраднаму: "Я табе*

*дам гранату, калі только ты мяне возмеш на рыбу, рыбу глушыць". Ён гаворыць: "Пойдзем". Ён пайшоў, гэту гранату зняў, я ж не снімала, я баялася, што думаю там без канца, рабяты падрываліся, каму рукі атарвала, каму ногі, каму што. У лодку селі і паехалі глушыць гэтую рыбіну, ён толькі кінуў, а мне паказалася, што лодка бяжыць, а я як закрычу: "Ратуйце, высадзі мяне". А ён гаварыць: "Ну каб знаў, то б ні за што не браў бы! Ты ж падумай, яна навернае узнарвалася ўнізу, толькі брызгалкі. Так во, а рыбіны ні адной нет, гэта цераз цябе я так, каб ты не закрычала, я б ціханька і рыбы тут было". Ехаў, кухтаў, крычаў: "Я больш цябе ніколі не вазьму". Вот так я рыбу глушыла (смяецца – аўт). [А другія глушылі?] – Канешне, яны ж настаяшча, т тады мы пойдзеш каля берага, а яе прыб'ецъ вална, калі вецер адтуль і прыб'ецъ, бела-бела, каля берагоў было рыбы*" [4]. Неабходна адзначыць, што такі спосаб "лоўлі рыбы" быў досыць распаўсюджаным і прыносіў вялікія страты. У выніку на падставе пастановы СНК БССР ад 15.06.1944 г. "Аб забароне глушэння рыбы ў азёрах і рэках БССР выбуховымі рэчывамі" выканкам Расонскага раёна забараніў з 21 верасня 1944 года глушыць рыбу у мэтах захавання сыравіннага запаса, а парушальнікаў прыцягваць да крымінальнай адказнасці [9, л. 43].

Падлеткавыя ўспаміны захавалі памяць і пра негатыўныя праявы пасляваеннай рэчаіснасці, звязаныя з выкарыстаннем службовага становішча прадстаўнікамі мясцовай улады: "*Я помню прадседацель быў.., я авец пасу, так есць хачу, і так вот хата іх стаіць і ніўка так, і я прыйшла сюды і сяжу, а яны выцягнулі кацёл фасолі бальшы, 15-літровы, і ў цэбар пры карове прынеслі есці. А я думаю, каб мне жменьку далі – я б паела. Яны скот кармілі, а людзі з голаду ўміралі. Во як было. Торкнулі адчапнога людзям, а гэты "кручкі" – брыгадзіры, кладаўшчыкі, шчатаводы самі сабе разбіралі*" [7].

Аналіз успамінаў рэспандэнтаў пра пасляваенную рэчаіснасць у супастаўленні з архіўнымі дакументамі паказвае, што матэрыялы вуснай гісторыі аб'ектыўна адлюстроўваюць складаны гістарычны перыяд і лакальныя асаблівасці рэгіёна. Успаміны з'яўляюцца каштоўнай гістарычнай крыніцай.

1. Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка (далее – ЗГА г. Полоцка). – Ф. 1093. – Воп. 1. – Спр. 9.

2. Фурсина, Н.О. Практика устной истории: детские воспоминания о Великой Отечественной войне / Н.О. Фурсина // Вестник Таганрогского института имени А.П. Чехова. – 2016. – №1. – С. 280-286.

3. Лобач, У.А. 1941 год вачыма дзяцей і падлеткаў Віцебшчыны: антрапалагічны дыскурс ваеннай гісторыі / У.А. Лобач // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. Гуманитарные науки.– 2020. – № 9. – С. 88 – 97.

4. Фальклорны архіў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (ФА ПДУ) : Зап. Сумко А. у 2019 г. Ад Кандрацьевай Надзеі Антонаўны, 1928 г. , в. Янкавічы Расонскага р-на.
5. ФА ПДУ : Зап. Лобач У., Сумко А.у 2019 г. ад Сапунова Пятра Аляксандравіча, 1938 г.н., в. Сядлова Расонскага р-на.
6. ФА ПДУ : Зап. Сумко А. у 2019 г. Ад Анцын Любові Іванаўны, 1937 г. Н., в. Горспля Расонскага р-на.
7. ФА ПДУ : Зап. Сумко А.В. у 2019 ад Высоцкай Таісіі Іванаўны, 1935 г.н, у в. Галоўчыцы Расонскага р-н.
8. ФА ПДУ : Зап. Лобач У. у 2019 г. Ад Кандрацьева Франца Францавіча, 1928 г.н., в. Янкавічы Расонскага р-на.
9. ЗГА г. Полоцка. – Ф. 1093. – Воп. 1. – Спр. 4.

## POST-WAR REALITY THROUGH THE EYES OF CHILDREN (BASED ON THE ORAL HISTORY OF THE ROSSONSKY DISTRICT)

***Alena Sumko,***
*Polotsk State University, Polotsk, Belarus,* Sumko_elena@mail.ru

The post-war reality of the local village community is considered. The key moments of childhood memories are identified and the features of representation of a complex historical period are characterized.

***Keywords: post-war village, oral history, children and adolescents, famine, life support strategy.***